**Выбары дэпутатаў**
**Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу**
**Рэспублікі Беларусь сёмага склікання**

**Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 7-12 кастрычніка**

*Назіранне за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» і ПЦ «Вясна» ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».*

## ВЫСНОВЫ

- 10 кастрычніка 2019 г. ЦВК прыняла Пастанову № 63, што вызначае пералік дакументаў, па якіх выдаецца бюлетэнь для галасавання. Пастанова пашырае кола асобаў, якія могуць атрымаць бюлетэнь не па пашпарце, за кошт работнікаў дзяржаўных арганізацый;

- 7 кастрычніка завяршыўся этап вылучэння кандыдатаў у дэпутаты. Паводле дадзеных ЦВК, у сёлетняй выбарчай кампаніі вылучаны 703 прэтэндэнты на дэпутацкі мандат, што больш, чым у мінулую кампанію. Заўважана тэндэнцыя да павелічэння прадстаўніцтва дзейсных парламентарыяў і прадстаўнікоў мясцовай улады. Нягледзячы на агульную большую колькасць вылучаных кандыдатаў, апазіцыйных прадстаўнікоў стала колькасна менш. Колькасць жанчын сярод вылучаных кандыдатамі ўзрасла з 23% у 2016 г. да 25% у 2019 г.;

- назіральнікамі кампаніі зафіксаваны асобныя матэрыялы, якія маюць прыкметы датэрміновай агітацыі ў адносінах да праўладных вылучэнцаў;

- адбыліся пасяджэнні АВК, на якіх разглядаліся пытанні арганізацыі працы камісій па праверцы подпісаў выбаршчыкаў, пададзеных вылучэнцамі ў АВК для рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты. У большасці выпадкаў назіральнікам было адмоўлена ў назіранні за працэдурай праверкі сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах;

- прайшлі судовыя пасяджэнні па разгляду скаргаў суб’ектаў, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў ва УВК, на адпаведныя рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Вярхоўны Суд не працягнуў практыку публікавання тэкстаў судовых пастаноў, прынятых па выніках разгляду гэтых скаргаў. Такім чынам, рашэнні раённых судоў па выніках разгляду скаргаў засталіся па-за ўвагай грамадскасці, што не садзейнічае адкрытасці выбарчай кампаніі.

## ПАСЯДЖЭННЕ ЦВК

10 кастрычніка 2019 г. адбылося пасяджэнне ЦВК, на якім зацверджаны графік размеркавання эфірнага часу для выступленняў кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, прыняты шэраг Пастаноў.

Пастанова № 63[1] вызначыла, што бюлетэнь для галасавання будзе выдавацца выбаршчыку на падставе спісу грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, пры прад'яўленні, акрамя пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, аднаго з наступных дакументаў: ваеннага білета (для вайскоўцаў тэрміновай службы), службовага пасведчання работніка дзяржаўнага органа (арганізацыі), пасведчання кіроўцы, пенсіённага пасведчання, пасведчання інваліда (пры наяўнасці у іх фатаграфіі), студэнцкага білета, даведкі органа ўнутраных спраў, якая пацвярджае асобу грамадзяніна (у выпадку страты (крадзяжу) пашпарта).

У параўнанні з мінулымі выбарамі, за кошт работнікаў дзяржаўных арганізацый пашырана кола асоб, якія могуць атрымаць бюлетэнь не па пашпарце. Раней бюлетэнь выдавалі грамадзяніну па пасведчанні дзяржаўнага служачага, зараз фармулёўка больш шырокая – работнікі дзяржаўных органаў (арганізацый). Пры гэтым на пасяджэнні ЦВК было падкрэслена, што гэта норма тычыцца толькі тых асоб, прозвішчы якіх ёсць у спісах выбаршчыкаў. Калі выбаршчыка няма ў спісе, то бюлетэнь можа быць выдадзены толькі па пашпарце, дзе ёсць адзнака аб рэгістрацыі. У такіх выпадках выбаршчыка ўнясуць у дадатковы спіс асоб, што атрымалі бюлетэні для галасавання.

Пастановай ЦВК № 61[2] унесены змены ў Пастанову № 41, якой было зацверджана Палажэнне аб парадку выкарыстання СМІ кандыдатамі ў дэпутаты. Цяпер

[1] Пастанова ад 10 кастрычніка 2019 г. № 63 “Аб дакументах, на падставе якіх выдаецца бюлетэнь для галасавання пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”.

[2] Пастанова ад 10 кастрычніка 2019 г. № 61 "Аб змене Палажэння аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання”.

прадугледжана павелічэнне на 40 хвілін часу для выступаў кандыдатаў, якія балатуюцца па выбарчых акругах г. Мінска. Гэта абумоўлена больш высокім конкурсам на дэпутацкі мандат у параўнанні з выбарамі 2016 г. Сёлета вылучана 176 кандыдатаў на 20 выбарчых акруг беларускай сталіцы (на выбарах у Палату прадстаўнікоў шостага склікання быў 131 чалавек).

На 10 кастрычніка, паведаміла Старшыня ЦВК, міжнароднымі назіральнікамі не пададзена ні адной скаргі. Звароты нацыянальных назіральнікаў парламенцкай кампаніі Л. Ярмошына ацаніла як неістотныя.

## ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ

Паводле дадзеных ЦВК[3], у сёлетняй выбарчай кампаніі вылучана 703 прэтэндэнты на дэпутацкі мандат. Сярод іх больш за ўсё – ад палітычных партый (424), за імі ідуць вылучаныя грамадзянамі шляхам збору подпісаў (272), менш за ўсё вылучана працоўнымі калектывамі (128) (частка прэтэндэнтаў вылучаны двума і трыма суб'ектамі).




[3] Даступна тут: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat11.pdf

Партыйнае прадстаўніцтва сярод вылучэнцаў кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у колькасных адносінах склала 424 асобы, што значна перавышае адпаведны паказнік у кампаніі 2016 г. (387 асоб). Параўнанне сёлетніх дадзеных з дадзенымі кампаніі 2016 г. паказвае змену суадносінаў колькасці кандыдатаў ад праўладных і апазіцыйных партый. Нягледзячы на агульную большую колькасць вылучаных кандыдатаў, апазіцыйных прадстаўнікоў стала колькасна менш.




Рэйтынг партый-лідараў [4] па колькасці вылучэнцаў выглядае наступным чынам:

[4] Больш падрабязна гл. тут: https://elections2019.spring96.org/be/news/94418.




Заўважана тэндэнцыя да павелічэння прадстаўніцтва дзейсных парламентарыяў і прадстаўнікоў мясцовай улады. У 2016 г. было вылучана 28 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 51 дэпутат мясцовых Саветаў дэпутатаў. У 2019 г. паўторна балатуюцца 34 дзеючыя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і 58 дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Колькасць жанчын сярод вылучаных кандыдатамі ўзрасла з 23% у 2016 г. да 25% у 2019 г.

## АСВЯТЛЕННЕ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ Ў СМІ

Дзяржаўныя СМІ публікуюць пераважна афіцыйную інфармацыю. Аднак назіральнікі кампаніі фіксуюць асобныя матэрыялы, якія маюць прыкметы датэрміновай агітацыі. Недзяржаўныя СМІ ў большасці абыходзяць увагай выбарчую тэматыку.

Штотыднёвая гарадская газета “Вечерний Минск” (№ 40) дае артыкул з вялікім фотаздымкам Марыны Лянчэўскай, якая вылучаецца па Заходняй выбарчай акрузе № 102 ад Беларускага саюза жанчын. Пазітыўны вобраз Лянчэўскай фарміруе таксама разгорнуты матэрыял у грамадска-палітычнай газеце “Мінскі кур’ер”, заснавальнікам якой з’яўляецца Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

Брэсцкая абласная газета “Заря” піша аб праўладнай вылучэнцы па Брэсцкай-Цэнтральнай выбарчай акрузе № 2, намесніцы дырэктара Гімназіі № 2 г. Брэста

Марыне Васько. Матэрыял пад загалоўкам “Школа – стабильный механизм, и революций здесь быть не должно” перадрукаваў Інтэрнэт-рэсурс “Віртуальны Брэст”.

“Маладзечанская газета” (№ 77) непасрэдна пад банерам “Выбары 2019” публікуе абвестку пра прыём грамадзян старшынёй камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама – Алегам Семянчуком, які вылучаецца кандыдатам. Мазырская газета “Жыццё Палесся” рэгулярна публікуе артыкулы і фотаздымкі Валянціны Назаранка – старшыні раённага Савета дэпутатаў і безальтэрнатыўнага прэтэндэнта у кандыдаты. Баранавіцкая штотыднёвая гезета “Intex-Press” піша пра Паўла Папко, прарэктара па выхаваўчай рабоце БарДУ, патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты па Баранавіцкай-Усходняй выбарчай акрузе № 6, падкрэсліваецца яго актыўная грамадзянская пазіцыя.

## ПРАВЕРКА ПОДПІСАЎ

Адбыліся пасяджэнні АВК, на якіх разглядаліся пытанні арганізацыі працы камісій па праверцы подпісаў выбаршчыкаў, пададзеных у АВК вылучэнцамі для рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты. Назіральнікі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” звярталіся ў АВК з просьбай дапусціць іх да назірання за працэдурай праверкі сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах. Большасці назіральнікаў адмовілі, аргументаваўшы наступным чынам: “праверка подпісаў з’яўляецца рабочым момантам працы АВК”; “назіральнікі маюць права прысутнічаць толькі на пасяджэннях камісіі, а праверка подпісаў праводзіцца не на пасяджэнні”, “прысутнасць назіральнікаў пры праверцы подпісаў не прадугледжана заканадаўствам”.

АВК Мінскай-Заходняй выбарчай акругі № 102 дазволіла назіраць за праверкай подпісаў назіральніку кампаніі Аляксею Лойку. Падчас работы члены камісіі абвінавацілі яго ва ўмяшальніцтве ў працэс праверкі подпісаў. Паводле ацэнкі Аляксея Лойкі, ён праходзіў непразрыста[5]. Таксама дазволілі назіраць за праверкай подпісаў назіральнікам кампаніі ў АВК Смаргонскай выбрачай акругі № 59, у АВК Аршанскай-Дняпроўскай выбрачай акругі № 26, у АВК Светлагорскай выбрачай акругі № 46 і некаторых іншых.

АВК Магілёўскай-Цэнтральнай выбарчай акругі № 85 і АВК Магілёўскай-Сельскай выбарчай акругі № 88 таксама дазволілі назіраць за праверкай подпісаў. У той жа час АВК Магілёўскай-Кастрычніцкай выбрачай акругі № 86 і АВК Магілёўскай-

[5] Больш падрабязна гл. тут: https://elections2019.spring96.org/be/news/94398.

Прамысловай выбрачай акругі № 87 адмовілі назіральнікам у такой магчымасці. Гэта сведчыць пра адсутнасць адзіных падыходаў у працы АВК.

## АБСКАРДЖАННЕ РАШЭННЯЎ АБ ФАРМІРАВАННІ УВК

На гэтым тыдні адбыліся судовыя пасяджэнні па разгляду скаргаў суб'ектаў, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў ва УВК, на адпаведныя рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Варта адзначыць, што Вярхоўны Суд напачатку выбарчай кампаніі заявіў пра рашэнне публікаваць тэксты рашэнняў судовых пастаноў, прынятых па выніках разгляду скарагаў, у ходзе выбараў для павышэння адкрытасці выбарчай кампаніі. Але гэта тычыцца толькі пастаноў, якія прынятыя абласнымі (Мінскім гарадскім) судамі. Такім чынам, рашэнні раённых судоў, прынятых па выніках разгляду скаргаў на рашэнні аб фарміраванні УВК, засталіся па-за ўвагай грамадскасці.

7 кастрычніка суд Ленінскага раёна Магілёва разгледзеў скаргу партыі АГП на неўключэнне сваіх сяброў у склад УВК. Старшыня абласной арганізацыі АГП Уладзімір Шанцаў запатрабаваў праз суд перагляду вынікаў фарміравання ўчастковых камісій. Падчас судовага пасяджэння ён звяртаў увагу на тое, што АГП была пазбаўлена права паўнавартасна ўдзельнічаць у палітычным жыцці, замест прадстаўнікоў партыі АГП у склад УВК уключаны прадстаўнікі праўладных грамадскіх аб'яднанняў. Суддзя пакінула скаргу без задавальнення.

Аналагічнае рашэнне прынята 7 кастрычніка судом Цэнтральнага раёна г. Гомеля па скарзе Гомельскай гарадской арганізацыі АГП на рашэнне Адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Гомеля. Довады прадстаўніка АГП пра дыскрымінацыю сяброў партыі пры прыняцці гэтага рашэння былі праігнараваны. І гэту скаргу суд пакінуў без задавальнення.

8 кастрычніка ў судзе Першамайскага раёна г. Віцебска прадстаўнікі апазыцыйных партый БНФ і АГП спрабавалі абскардзіць неўключэнне сваіх сяброў у склад УВК. Прадстаўнікі адміністрацыі Першамайскага раёна не здолелі патлумачыць суду, чаму ў склад УВК увайшло 15 прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыва і ніводнага прадстаўніка апазыцыйнай партыі. Тым не менш, суд пакінуў рашэнне адміністрацыі Першамайскага раёна без зменаў, а скаргі без задавальнення.

8 кастрычніка суд Фрунзенскага раёна г. Мінска таксама не задаволіў скаргу ГА БНФ "Адраджэнне" на рашэнне Адміністрацыі Фрунзенскага раёна. Намеснік пракурора Фрунзенскага раёна, які прысутнічаў на судовым пасяджэнні, адзначыў,

што дзеючае заканадаўства не абавязвае матываваць адмову ва ўключэнні тых ці іншых кандыдатаў у склад УВК.